*Краязнаўства*

**Ігар Пракаповіч: Экспедыцыя на “Крыжоўкі”**

Напрыканцы мінулага тыдня, 26-27 ліпеня 2018 года, удзельнікі краязнаўчага гуртка “Terra incognita” Пастаўскай гімназіі разам з сябрамі Таварыства беларускай мовы здзейснілі двухдзённую экспедыцыю ў паўднёвую частку Пастаўскага раёна. Мэта вандроўкі - вывучэнне прыродна-гістарычнага комплекса “Крыжоўкі” каля азёр Доўжа і Варанец, на невялікай тэрыторыі якога змяшчаецца шэраг рэдкіх і ўнікальных для Беларусі аб’ектаў. Удзельнікі экспедыцыі даехалі на аўтобусе да вёскі Чарняты, а потым рушылі па Старамядзельскай дарозе ў напрамку на вёску Пятроўшчына. На шляху давялося фарсіраваць раку Мядзелка, выпрабоўваць моц ног асцём скошанай збажыны, прадзірацца праз беларускія “джунглі” з зарасніку вольхі, лазы і крапівы пад пагрозлівым гулам камароў і аваднёў.









Пасля ўсталявання лагера і абеду група зрабіла радыяльны выхад, падчас якога былі абследаваны руска-германскі могільнік часоў I сусветнай вайны, папуляцыя капавых асін, паміраючы дуб-волат, былая гідратэхнічная сістэма Варанец-Мядзелка з падмуркам млына, бабровая “імперыя”, маляўнічыя берагі возера Варанец.









Вечарам удзельнікі экспедыцыі адпачывалі: гулялі ў валейбол, купаліся, спявалі песні пад гітару, гулялі ў “стратэгію”.






На наступны дзень вывучалася ўсходняя частка прыродна-гістарычнага комплексу “Крыжоўкі”. Былі абследаваны з фіксацыяй дакладных каардынат праз навігатар такія адметныя аб’екты як германскі ўмацаваны раён I Сусветнай вайны з сістэмай траншэй, акопаў і жалезабетонных бліндажоў, месца былога сельскагаспадарчага вучылішча, падмурак маўзалея-капліцы У. Друцкага-Любецкага, помнік на месцы

бою часоў II Сусветнай вайны, унікальная сістэма з трох невялікіх рознаўзроўневых Сарочынскіх азёр.











Вечарам група вярнулася ў Паставы.

У выніку праведзеных даследаванняў удалося сабраць дадатковы матэрыял пра цікавыя аб'екты комплекса "Крыжоўкі", вызначыцца з ніткай турысцка-экскурсійнага маршрута, які плануецца бліжэйшым часам уладкаваць.

Ігар Пракаповіч, кіраўнік экспедыцыі

**Igar Prakapovich: Expedition to "Kryzhouki" (Pastavy region, Belarus)**
***(magazine "CULTURE, NATION", November 2018, issue 22, p.51-56,*** [www.sakavik.net](http://www.sakavik.net) ***)***

In this year, as in the previous one, we received interesting information from Pastavy region sent by Igar Prakapovich, a well-known local historian, teacher, poet and writer. I. Prakapovich takes an active role in raising children with their love for their land and with their knowledge of the history of his small homeland. This time, he describes an expedition with students in the natural and historical complex "Kryzhouki", located near the lake Douza and Varanets bordering Myadzel region. As a result of the research it was able to collect additional material and to determine the possible creation of tourist routes.